■ Экслібрыс «Звязды»

ЗАЗІРНУЦЬ ЗА ГАРЫЗОНТ

Валеры Гапееў. ***Я размалюю для цябе неба: аповесць, п'еса, апавяданні.*** *— Мінск: Мастацкая літаратура, 2013. — 222 с.*

У літаратуры пісьменніку досыць проста зарабіць рэпутацыю майстра пэўнага жанру. Выдаў больш-менш паспяховую кнігу — і яго будуць згадваць як «майстра дэтэктыву», «адмыслоўца ў жанры рамана фэнтазі» ці «вядомага аўтара гістарычных кніг». А калі гэты жанр у сучаснай літаратуры досыць рэдкі, амаль не распрацаваны калегамі аўтара, то ад біркі спецыяліста менавіта ў гэтым кірунку будзе пазбавіцца яшчэ складаней. Вось і ад празаіка з Івацэвіч Валерыя Гапеева пасля досыць паспяховай кнігі для падлеткаў «Урокі першага кахання» выдаўцы, чытачы і, мяркую, крытыкі чакаюць у першую чаргу новых твораў для тынейджараў.

Зборнікам прозы Валерыя Гапеева «Я размалюю для цябе неба» гэтыя надзеі часткова апраўдваюцца, але кніга перадусім раскрывае новыя рысы творчай індывідуальнасці аўтара, прадстаўляе яго бачанне іншых кірункаў і жанраў кароткай прозы. Часам пісьменніку нават недастаткова стандартных жанраў (апавядання, аповесці, навелы), і ён з мэтай удакладнення ўласнай творчай задумы прапаноўвае чытачу больш разгорнутае іх азначэнне. Напрыклад, «кароткая аповесць», «амаль фантастыка», «віртуальная рэальнасць», «містычная рэальнасць», «амаль казка». Але ці сапраўды патрэбныя гэтыя дадатковыя абазначэнні?

Часам яны працуюць на карысць і ўспрымаюцца як устаноўка на пэўны настрой яшчэ да чытання твора. Гэты прыём выдатна працуе, напрыклад, з апавяданнем «Game Begins!». Кароткі твор — віртуальная рэальнасць — служыць нібыта перасцярогай: не варта занадта захапляцца камп'ютарнымі гульнямі, яны могуць паглынуць і асобу чалавека, і яго жыццё.

Але прывяду і прыклад не надта ўдалага «прадвызначэння жанру». Твор, што аўтар называе «амаль казкай», — а яго назва стала назвай усяго зборніка — больш дакладна было б абазначыць, як «сентыментальную антыўтопію». Мяркуйце самі: падзеі апавядання-казкі «Я размалюю для цябе неба» адбываюцца ў прыдуманым свеце, які існуе пад Купалам. Межы свету-дзяржавы вызначаюцца межамі Купала. Усе людзі маюць магчымасць «счытваць» пачуцці і эмоцыі ўсіх насельнікаў краіны. То бок, у любы момант часу кожны чалавек адчувае пачуцці ЎСІХ жыхароў Купала. Сем'і жывуць у празрыстых дамах, пары складаюцца не ўласным выбарам мужчыны і жанчыны, але адмысловай воляй кіраўніцтва Купала. Грамадства дакладна раздзелена на групы-прафесіі, і кожны займаецца толькі сваёй справай. Вось і прыкметы антыўтопіі. Амаль як у Замяціна.

У творы Валерыя Гапеева «Я размалюю для цябе неба», дзе ў якасці запавету, што перадаецца як вялікі сакрэт, служыць вершпесня Анры Валахонскага «Рай», гэта магчыма. Тут не адчуваецца прадвызначанасці лёсу герояў. Аказваецца, што варта толькі захацець змяніць свет, — і гэта стане магчыма. Насельнікі Купала спяваюць песню пра разнастайнасць свету па-за іх грамадствам як вялікую таямніцу, што валодае моцнай сілай. І ведаеце, песня-заклён перамагае. Момант, які павінен быў быць дэманстрацыяй найвышэйшай улады Купала, ператвараецца ў час яго разбурэння. Насельнікі вызваляюцца і пакідаюць межы гэтага свету. Што там, за гарызонтам, чытачу невядома. Але верыцца, што Купал — своеасаблівая мяжа паміж антыўтопіяй і ўтопіяй.

Аповесць «Ксюхіна поле» і школьная п'еса «Сертыфікат» — прыклады якаснай літаратуры для падлеткаў. Тут падлеткі, з аднаго боку, самі ўплываюць на свой лёс, самі будуюць сваё жыццё (а гэтага ох як хочацца ў іх узросце), але з другога — іх рашэнні правільныя, узважаныя, годныя. Часам нават дарослыя не здольныя на такія смелыя і адказныя ўчынкі. І гэта не маралізатарства, не пустое пазёрства, а ўзважаная, лагічная і адзіная правільная пазіцыя кожнага са школьнікаў. Аўтар — да яго гонару — тут займае надзвычай карэктную пазіцыю. Ён не проста апісвае сітуацыю выбару, у якую трапляе герой, але і тлумачыць ход яго думак, прыводзіць аргументы, чаму менавіта такое выйсце адзінае магчымае.

Дык, можа, недарэмна за Валерыем Гапеевым замацаваўся імідж аўтара выдатных твораў для падлеткаў і зусім няварта спяшацца разбураць гэты вобраз?

Марына ВЕСЯЛУХА

■

■ Напярэдадні чэмпіянату

ГАСЦІНІЦЫ — СЕРТЫФІКАВАЦЬ, ШТАТЫ — УКАМПЛЕКТАВАЦЬ

На пасяджэнні падкамітэта па пытаннях гандлёвага забеспячэння і арганізацыі харчавання ў рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі, які прайшоў пад старшынствам міністра гандлю Валянціна Чэканава, быў разгледжаны ход падрыхтоўкі аб'ектаў бытавога абслугоўвання насельніцтва да гэтай падзеі.

Як далажыў начальнік упраўлення бытавога і гасцінічнага абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама Андрэй Новікаў, летась на рэканструкцыю і рамонт аб'ектаў бытавога абслугоўвання было затрачана 17 мільярдаў рублёў. Сёлета яшчэ 5 мільярдаў рублёў пойдзе на прывядзенне ў парадак 123 аб'ектаў.

Адным з галоўных было пытанне адносна мінскіх гасцініц: як яны сустрэнуць шматлікіх замежных гасцей. Іх паслугі павінны адпавядаць заяўленай класіфікацыі. Таму міністр гандлю даручыў да канца сакавіка сертыфікаваць усе гатэлі сталіцы, калі некаторыя з іх яшчэ гэтага не зрабілі, бо абслугоўваць пастаяльцаў могуць толькі сертыфікаваныя гасцініцы.

Падчас пасяджэння падкамітэта дэталёва былі разгледжаны пытанні, звязаныя з аказаннем шматлікіх паслуг. Напрыклад, у гасцей і ўдзельнікаў спартыўнага спаборніцтва не павінна ўзнікаць праблем з пракатам аўтамабіляў, з абслугоўваннем таксі і на СТА, з рэжымам працы пральняў, швейных і абутковых майстэрняў.

Асобна ішла размова пра кадравае забеспячэнне ўжо існуючых гасцініц і тых, што яшчэ будуюцца, а таксама аб'ектаў грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання. Міністр гандлю даручыў максімум да 1 красавіка вырашыць пытанне з камплектацыяй неабходным персаналам гэтых аб'ектаў.

На выніковым пасяджэнні падкамітэта па пытаннях гандлёвага забеспячэння і арганізацыі харчавання ў рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года будзе праверана выкананне ўсіх даручэнняў, што даваліся падчас рабочых сустрэч.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Філатэліст

НА МАРКАХ — НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовыя маркі «Хорум» і «Сурма». Гэтыя інструменты (першы нагадвае гарбуз з устаўленай у яго жалейкай) вярнуў да жыцця заслужаны дзеяч мастацтваў, музыка і народны майстар-рэстаўратар Уладзімір Якаўлевіч Пузыня. Раней і яго ж клопатам былі рэканструяваны дуда, бубен, удасканалена ліра і жалейка.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

Маленькія хітрыкі

✓ **Кроп лепш сеяць на сонцы, бо ў цені ў яго змяншаецца водар лісця. Пад кроп не ўносяць попел і вапну.**

✓ Клематысы ўвесну паліваюць вапнавым малаком — на 10 літраў воды 100—150 грамаў вапны.

✓ **Каб парасткі барбарысу вырасталі тоўстымі, глебу пад раслінамі ўгнойваюць кожны год.**

✓ Яблыні і грушы патрабуецца больш калію, а вішні — азоту.

✓ **Калі расаду кожны дзень па 1-2 хвіліны пагладжваць па верхавінах, яна не будзе выцягвацца. Пры дотыку вылучаецца этылен, які стрымлівае гэты працэс.**

✓ Суніцы карысна мульчыраваць іглічным ападам. Гэта палепшыць смак ягад, а таксама дапаможа справіцца з шэрай гнілатой, шашолкай, кляшчом, драцянікам. А мульчыраванне папараццю дапаможа суніцам справіцца з нематодамі і шэрай гнілатой.

Сакрэты садаводаў

ПАРЭЧКІ ЛЮБЯЦЬ СОНЦА

Парэчкі ўжо ранняй вясной варта падрыхтаваць да летняга сезона.

Як толькі набракнуць пупышкі, вельмі карысна зрабіць кустам гарачы душ. Ваду награваюць прыкладна да 65-70 градусаў і хутка з палівачкі абліваюць кусты. Такая працэдура пагібельна дзейнічае на шкоднікаў, якія прачынаюцца, і вельмі спрыяльная для парэчак.

Глебу пад кустамі трэба прысыпаць попелам або мінеральнымі ўгнаеннямі і троху ўзрыхліць. Зверху насыпаць тоўсты слой мульчы з перапрэлай арганікі, якая на працягу ўсяго сезона будзе служыць не толькі падкормкай, але і шчытом ад шкоднікаў, якія зімавалі ў глебе, не дасць прарастаць пустазеллю і захавае карані ад перасыхання.

Парэчкі вельмі любяць вільгаць, таму ў засуху іх неабходна добра паліваць.

Штогод трэба выразаць 3-5-гадовыя парасткі, такім чынам амалоджваючы куст і стымулюючы плоданашэнне. Дарэчы, ягады пры гэтым вырастаюць буйнейшыя, а куст менш хварэе, бо крона прарэджана і пазбаўлена ад старых галінак, на якіх прытаіліся лічынкі і ўзбуджальнікі захворванняў. Абрэзку можна рабіць вясной, летам пасля плоданашэння ці восенню. Летняя абрэзка лепшая, таму што дазваляе не толькі сабраць ураджай з прызначаных для выдалення галінак, але і за час, які застаўся, вырасціць моцны параснік для будучага ўраджаю.

Саджаць або перасаджваць маладыя саджанцы парэчак і агрэсту лепш за ўсё ў канцы лета, а не ўвесну і ўвосень. Яны паспяваюць выдатна прыняцца да зімы і вясной ужо без адаптацыі адразу ж актыўна кранаюцца ў рост.

Ёсць адзін цікавы момант у развядзенні парэчак чаранкамі. Чаранкі варта саджаць на сонечным месцы, нягледзячы на тое, што ў паўцені яны лягчэй укараняюцца. Саджанцы, выгадаваныя ў цені, даюць значна менш ягад, якія да таго ж і кіславатыя. Гэтае правіла спрацоўвае нязменна, нават калі потым падрослую парэчку перасадзіць на самае сонечнае месца.

Незвычайная гародніна і садавіна

ПЛУОТ

Гібрыд слівы і абрыкоса, плуот названы па першым апошнім складзе двух англійскіх слоў: plum (зліву) і apricot (абрыкос). У плуота, які больш усё ж пайшоў у сліву, ёсць родны брат — апрыум, які, наадварот, больш падобны на абрыкос. Абалонка плуота можа быць руковага, зялёнага, бардовага і фіялетавага колеру, а ўсярэдзіне — ад белага да насычанага слівовага. Яго вывелі ў 1989 годзе ў каліфарнійскім гадавальніку. Сёння ў свеце налічваецца адзінаццаць гатункаў плуота, два гатункі апрыума, адзін гатунак нектаплама (гібрыд нектарына і слівы), а таксама адзін гатунак пічплама (гібрыд персіка і слівы).

З плуота атрымліваецца выдатны сок, дэсерты, хатнія нарыхтоўкі і нават віно. А ў свежым выглядзе гэта сапраўдны ласунак, бо плуот значна саладзейшы за слівы і абрыкос.

ЖОЎТЫ БУРАК

Наўрад ці жоўты (ці, як яго яшчэ называюць, залаты) бурак атрымае прызнанне на нашым рынку: розуму неспасціжныя жоўтыя боршч, бацвінне, вінегрэт, селядзец пад жоўтым футрам. А вось амерыканцы, далёкія ад нашых кухонных традыцый, наадварот, не нарадуюцца з жоўтага бурака: ён не пэцкаецца пры прыгатаванні.На смак гэтая агародніна ад звыклай нам амаль не адрозніваецца. Такая ж салодкая, гатовая пасябраваць з любым прадуктам, добрая ў запечаным выглядзе і нават у чыпсах. Лісце жоўтага бурака можна выкарыстоўваць у свежым выглядзе для салатаў.

НЭШЫ

Нэшы — гэта гібрыд яблыка і грушы, які культывуецца шмат стагоддзяў у Азіі. Яшчэ яго завуць азіяцкай, пясочнай, вадзяной ці японскай грушай. Круглы яблык на смак аказваецца сакавітай, хрумсткай грушай. Колер фрукта — ад бледна-зялёнага да аранжавага. Яблык-груша мае перавагу перад звычайнай грушай: яна цвярдзейшая, таму лепш пераносіць транспартаванне і захоўванне. Выкарыстоўваць фрукт лепш «сола» ці ў салатах, бо нэшы змяшчае шмат вады, што не вельмі добра для тэрмічнай апрацоўкі.